**ДЫСПУТ** (ад лац. disputare – разважаць, спрачацца) – 1) калектыўнае публічнае абмеркаванне якіх-н. актуальных праблем, адзін з актыўных метадаў навучання.

У школьнай практыцы шырока выкарыстоўваюцца літаратурныя дыспуты. Адметнасць літаратурнага дыспута ў тым, што вучням прапануецца абмеркаваць такія пытанні (звычайна маральна-этычнага зместу), якія могуць выклікаць процілеглыя адказы.

Дыспут можа быць запланаваны славеснікам як частка ўрока. Магчыма таксама пабудова ўсяго ўрока ў форме дыспуту. Практыка паказвае, што атрыманыя ў часе літаратурнага дыспуту веды пераходзяць у перакананні: вучні набываюць навыкі аргументавана абараняць сваю пазіцыю. Многія настаўнікі-філолагі паспяхова выкарыстоўваюць іх у штодзённай практыцы. Аднак для ўзнікнення сапраўднай дыскусіі на ўроку літаратуры неабходны адпаведныя ўмовы: адных завучаных фраз з падручніка тут мала, патрэбны свае думкі, перакананні, уражанні. Акрамя абавязковага бездакорнага ведання зместу твора, вучні павінны адчуваць сябе камфортна: давяраць педагогу, не баяцца выказваць альтэрнатыўныя думкі.

Правільная пастаноўка настаўнікам праблемнага пытання дае магчымасць дасягнуць станоўчых вучэбна-выхаваўчых вынікаў. Кожнае пытанне мае не толькі пазнавальнае, але і маральна-выхаваўчае значэнне, таму што вучыць глыбока разумець ідэйна-эстэтычны змест твора. Дыскусійным павінен быць і сам твор.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ